Голас Радзімы

№ 47 (2137)
23 лістапада 1989 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.





Мінск, 11 лістапада 1989 года. Урачыстае пасяджэнне прадстаўнікоў грамадскасці рэспублікі, прысвечанае 50-годдзю ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у складзе Савецкага Саюза.

НА ЗДЫМКАХ: у прэзідыуме ўрачыстага пасяджэння; у зале опернага тэатра, дзе праходзілі ўрачыстасці; удзельнікі ўрачыстага пасяджэння ветэраны партыі В. КАЛАМЕЕЦ, Я. КІРЫЧЭНКА і Л. РУБАНАЎ (злева направа).



СХОД

СВЯТА МАНГОЛЬСКАГА НАРОДА

Шасцідзесяціпяцігоддзю абвяшчэння Мангольскай Народнай Рэспублікі быў прысвечаны вечар, які адбыўся ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі.

З расказам пра шляхі станаўлення і развіцця першай на Азіяцкім кантыненце сацыялістычнай дзяржавы, прыклады ўсебаковага развіцця брацкіх сувязей паміж МНР і СССР выступіў старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Таварыства савецка-мангольскай дружбы, прафесар А. Ключароў.

Са словам у адказ да прысутных звярнуўся генеральны консул МНР у Ленінградзе Зандангійн Энэбішу, які прыбыў у Мінск.

Адбыўся канцэрт мастацкага калектыву мангольскіх студэнтаў, якія вучацца ў Ленінградзе.

УЗНАГАРОДА



За паспяховае правядзенне Усесаюзнай комплекснай навукова-спартыўнай экспедыцыі «НЕВО» па шляху «З варагаў у грэкі» (1985—1989 гады) Прэзідыум Геаграфічнага таварыства Акадэміі навук СССР узнагародзіў юбілейным медалём імя М. Пржавальскага шлюпачны экіпаж Беларускага політэхнічнага інстытута «Нева-Нёман-89» Усесаюзнай экспедыцыі «НЕВО» (г. Мінск).

У адным з наступных нумароў газеты будзе надрукаваны падрабязны матэрыял, як праходзіла гэтая экспедыцыя.

НА ЗДЫМКУ: медаль, якім былі ўзнагароджаны беларускія ўдзельнікі экспедыцыі.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

ДНІ ЭКАНОМІКІ І ТЭХНІКІ ЧССР

Азнаямленне савецкіх спецыялістаў і кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў з дасягненнямі і магчымасцямі чэхаславацкай эканомікі, навукі і тэхнікі, сумесны пошук новых форм супрацоўніцтва — такая мэта Дзён эканомікі і тэхнікі ЧССР, якія прайшлі ў Мінску.

На афіцыяльнай цырымоніі адкрыцця чэхаславацкіх сяброў цёпла вітаў намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР М. Макаед. Ён адзначыў плённасць развіцця эканамічных, гандлёвых, культурных сувязей паміж ЧССР і Савецкай Беларуссю.

Кіраўнік дэлегацыі ЧССР, намеснік Старшыні ўрада Чэшскай Сацыялістычнай Рэспублікі Я. Тлапак, які выступіў са словам у адказ, назваў канкрэтныя адрасы супрацоўніцтва. Па ўзыходзячай лініі развіваюцца, напрыклад, кантакты паміж Мінскім аўтамабільным заводам і прадпрыемствам «Татра», падшыпнікавым заводам у Мінску і аднатыпнымі прадпрыемствамі ў Брно і Прэшаве, «Гомсельмашам» і «Аграбудам». Прыводзіліся іншыя прыклады добрасуседства.

У выставачным комплексе Гандлёва-прамысловай палаты БССР адкрылася экспазіцыя, у якой прадстаўлена прадукцыя знешнегандлёвых аб'яднанняў ЧССР «Будімпарт» і «Кераметал». На працягу тыдня чэхаславацкія спецыялісты выступалі ў Мінску з лекцыямі і дакладамі. Адбылася дэманстрацыя адзення чэхаславацкай вытворчасці, былі праведзены дэгустацыі славутага чэшскага піва, ласункаў. На прадпрыемствах горада прайшлі сустрэчы з вядучымі спецыялістамі вядомых чэхаславацкіх фірм.

БЕЛАРУСЬ У ААН

ПРЫМЕРКАВАНА ДА ЮБІЛЕЮ

У 1990 годзе сусветная грамадскасць адзначыць 500-годдзе з дня нараджэння беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, асветніка, вучонага, мысліцеля і пісьменніка эпохі Адраджэння — Францыска Скарыны.

Такое рашэнне па ініцыятыве Беларускай ССР прыняла на 25-й сесіі Генеральная канферэнцыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры, якая праходзіць у Парыжы. Рэзалюцыю, унесеную беларускай дэлегацыяй, якую ўзначальвае міністр культуры БССР Я. Вайтовіч, сумесна з дэлегацыямі ГДР, НРБ, ПНР, СССР, УССР, ЧССР, В'етнама, Аргенціны, Грэцыі і Мексікі, адзінадушна падтрымалі ўсе краіны, якія ўдзельнічаюць у рабоце сесіі.

Цырымонія святкавання 500-гадовага юбілею Ф. Скарыны адбудзецца ў штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы і будзе праходзіць у рамках мерапрыемстваў Сусветнага дзесяцігоддзя развіцця культуры, што надае па-сапраўднаму агульначалавечы характар гэтай ініцыятыве.

Аб 500-й гадавіне Францыска Скарыны будзе паведамлена ў календары гадавін вялікіх людзей і гістарычных падзей (1900—1991 гады), які распаўсюджваецца па ўсім свеце.

Выбранне Беларускай ССР у адзін з важнейшых выбарных органаў ЮНЕСКА—яе Выканаўчы савет, якое адбылося на 25-й сесіі Генеральнай канферэнцыі,—сведчанне высокага прызнання сусветнай грамадскасцю таго ўкладу, які ўносіць Беларусь, яе народ і культура ва ўмацаванне аб'ядноўваючых пачаткаў сучаснай цывілізацыі.

НАРОДНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ

НА СУСТРЭЧУ З АМЕРЫКАНСКІМІ РАВЕСНІКАМІ

З Мінска ў Злучаныя Штаты Амерыкі выехала дэлегацыя Беларускага камітэта абароны міру, у склад якой уваходзяць 16 вучняў старшых класаў і два настаўнікі мінскай сярэдняй школы № 54 з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы.

Абмен паміж школьнікамі Мінска і іх амерыканскімі равеснікамі па каналу народнай дыпламатыі мае быць рэгулярным. Крыху больш за паўтара года прайшло з таго дня, калі адбылася першая сустрэча савецкіх і амерыканскіх школьнікаў на беларускай зямлі. І вось ужо сёлета ў лютым вучні сярэдняй школы № 30 наведалі ЗША, а праз два тыдні пасля свайго вяртання яны прымалі ў сябе дома амерыканскіх дзяцей, у сем'ях якіх жылі ў ЗША.

У сакавіку гэтага года ў гасцях у вучняў школы № 103 былі амерыканскія школьнікі з горада Портленд (штат Арагон), які ў сакавіку 1990 года будзе прымаць мінскіх школьнікаў.

Праграма паездкі ў Паўднёвы Ліхай (штат Пенсільванія) будзе вельмі насычанай і цікавай. Яна прадугледжвае пражыванне ў амерыканскіх сем'ях, сумеснае наведванне ўрокаў у школе і правядзенне вольнага часу. Прадастаўляецца унікальная магчымасць пазнаёміцца не толькі са сваімі заакіянскімі равеснікамі, але і іх педагогамі, бацькамі, бытам і нацыянальнымі святамі, традыцыямі. Прадугледжаны экскурсіі ў Нью-Йорк, Вашынгтон, Філадэльфію, Ланкастар, Куперсбург, Балтымор і іншыя гарады.

ВОСЕНЬСКАЯ ВЫСТАЎКА



У Брэсце прайшла традыцыйная восеньская выстаўка «Грыбы беларускіх лясоў». У яе экспазіцыі — больш за 150 відаў гэтых лясных дароў. Ёсць і унікальныя — вожык-грыб каралападобны, грыб капусны, занесеныя ў Чырвоную кнігу СССР. Арганізатары выстаўкі — загадчык лабараторыі аховы прыроды дзяржаўнай паляўніча-запаведнай гаспадаркі «Белавежская пушча» П. Міхалевіч і навуковае таварыства навучэнцаў Камянюцкай сярэдняй школы Камянецкага раёна.

НА ЗДЫМКУ: у зале выстаўкі.

50-ГОДДЗЕ ЎЗ'ЯДНАННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БССР

АДНАЎЛЕННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Беларускі народ урачыста адзначыў важную і радасную падзею — 50-годдзе ўз'яднання Заходняй Беларусі з Беларуссю Савецкай. Паўстагоддзя — час дастатковы, каб па вартасці ацаніць і засведчыць, што дзеянні Савецкага ўрада ў адносінах беларусаў і украінцаў, якія амаль два дзесяцігоддзі гібелі пад уладай буржуазнай Польшчы, на той час былі адзіна правільнымі, адпавядалі інтарэсам і спадзяванням нашых паняволеных братоў.

Чаму нават у гэтыя ўрачыстыя дні трэба рабіць агаворкі, некага ў нечым пераконваць? У наш час плюралізму думак, тэндэнцыі ставіцца да мінулага надзвычай крытычна, часам прадузята, вакол падзей, што адносяцца да таго перыяду, ідуць вострыя дыскусіі, выказваюцца часам зусім супрацьлеглыя думкі.

Міністр замежных спраў СССР Э. Шэварднадзе, закранаючы палітычную і прававую ацэнку дагавора 1939 года паміж СССР і Германіяй, сказаў аб намеры правесці сур'ёзнае, кампетэнтнае, адказнае даследаванне, каб ачысціць гісторыю савецка-польскіх адносін ад усіх наслаенняў, што перашкаджалі б збліжэнню абодвух народаў.

Аднак не выклікае сумнення, што прыход у Заходнюю Беларусь Чырвонай Арміі быў для тых, хто жыў там, падзеяй доўгачаканай і радаснай. Пра гэта сёння мы чуем з вуснаў людзей, якія змагаліся за вызваленне свайго краю, з надзеяй глядзелі на Усход у чаканні дапамогі. Ветэраны Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі расказваюць аб сваім удзеле ў рэвалюцыйнай барацьбе супраць сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, аб подзвігу таварышаў па падполлі, якія не дажылі да перамогі. Расказваюць не толькі непасрэдныя ўдзельнікі змагання. Бадай, у кожнай заходнебеларускай вёсцы яшчэ ёсць людзі, якія памятаюць падзеі 50-гадовай даўнасці.

«Ніякія зводкі, рэляцыі, пазнейшыя сведчанні гісторыкаў не ў сілах перадаць таго энтузіязму і радасці, з якімі працоўныя Заходняй Беларусі сустрэлі Чырвоную Армію», — сказаў у сваім выступленні на урачыстым пасяджэнні 11 лістапада 1989 года былы член КПЗБ пісьменнік Максім Танк.

Пасяджэнне праходзіла ў Дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета БССР, на які былі запрошаны ўдзельнікі падзей 1939 года, ветэраны вайны і працы, рабочыя, дзеячы навукі і культуры, працаўнікі сельскай гаспадаркі.

З дакладам «Аб 50-годдзі ўз'яднання Заходняй Беларусі з Беларускай ССР» выступіў Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Мікалай Дземянцей. Па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора, сказаў ён, заключанага абяскроўленай Савецкай Расіяй у сакавіку 1921 года, да буржуазна-памешчыцкай Польшчы адышлі тэрыторыі цяперашняй Гродзенскай і Брэсцкай, а таксама паўночна-заходнія раёны Мінскай і Віцебскай абласцей, якія складалі амаль палавіну тэрыторыі і насельніцтва рэспублікі.

Заходняя Беларусь стала, па сутнасці, калоніяй польскіх памешчыкаў і капіталістаў, якія разглядалі яе толькі як крыніцу таннай сыравіны і рабочай сілы. Цяжкі сацыяльны прыгнёт пераплятаўся з нацыянальным бяспраўем.

У краі быў устаноўлены жорсткі рэпрэсіўны рэжым. Сапраўдным выразнікам рэвалюцыйных, вызваленчых імкненняў шырокіх працоўных мас выступала Камуністычная партыя Польшчы і яе састаўная частка — Кампартыя Заходняй Беларусі, створаная ў кастрычніку 1923 года. Працуючы ў цяжкіх умовах нелегальнага становішча, Кампартыя Заходняй Беларусі настойліва змагалася за стварэнне інтэрнацыянальнага адзінства працоўных усіх нацыянальнасцей.

Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР 17 верасня 1939 года паклала канец таму ненатуральнаму стану, калі беларуская нацыя была раздзелена на дзве часткі. У выніку ўз'яднання карэнныя інтарэсы беларускага народа, яго этнічная і тэрытарыяльная агульнасці, яго сучаснае і будучыня былі надзейна абаронены ўсёй магутнасцю вялікай сацыялістычнай дзяржавы — Саюза ССР.

З вышыні дзён сённяшніх, з таго ўзроўню эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця, якога дасягнула наша рэспубліка ў пасляваенны перыяд, многае бачыцца і ацэньваецца неадназначна. Але, думаецца, ніхто не мае права не ўлічваць тое, што савецкі народ ішоў нязведанымі шляхамі гісторыі і пры вырашэнні шматцяжкіх задач вымушаны быў разлічваць выключна на ўласныя сілы і магчымасці. Што датычыць нашай рэспублікі, у тым ліку і заходніх абласцей, то, як вядома, пасля Вялікай Айчыннай вайны нам у эканоміцы і культуры многае, калі не ўсё, прыходзілася пачынаць з нулявой адзнакі.

У адпаведнасці з прынцыпамі ленінскай нацыянальнай палітыкі ўрад нашай рэспублікі звяртаў самую пільную ўвагу на пераадоленне ў заходніх абласцях атрыманай у спадчыну ад мінулага эканамічнай і культурнай адсталасці. Паслядоўна праводзілася лінія на паскоранае развіццё прамысловасці, уздым прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі, ажыццяўленне буйнамаштабных пераўтварэнняў у сацыяльнай сферы, у развіцці духоўнага жыцця працоўных.

Падзеі 1939 года, мужнасць і стойкасць людзей, якія прымалі ў іх непасрэдны ўдзел, сказаў Мікалай Дземянцей, умацоўваюць нашу веру ў правільнасць зробленага намі выбару, у поспех рэвалюцыйных пераўтварэнняў, накіраваных на нададзенне сацыялізму сапраўды ленінскага аблічча.

ДА АГУЛЬНАГА СТАЛА

Доследны рыбгас «Белаазерскі», які выкарыстоўвае ў асноўным тэрмальныя воды Бярозаўскай ДРЭС, прадасць у гэтым годзе насельніцтву Брэстчыны 840 тон рыбы. Разводзяць тут такія каштоўныя пароды, як белы амур і таўсталобік, у бліжэйшыя гады з'явіцца канальны сом. Усё больш прадукцыі атрымлівае калектыў рыбгаса і на блізкіх азёрах Белае, Чорнае, Спораўскае.

НА ЗДЫМКАХ: промысел вядуць рыбакі Уладзімір МЕЛЕХ (злева) і Сцяпан СУЛІМА; на Белым возеры.

Фота Э. КАБЯКА.

МЕРКАВАННЕ ВУЧОНАГА-ЭКАНАМІСТА

ГАСРАЗЛІК: ДРУГОЕ ДЫХАННЕ

Прафесар Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі М. КУНЯЎСКІ кіруе навуковай групай, якая вось ужо некалькі гадоў сумесна з работнікамі вытворчасці займаецца ўдасканаленнем гаспадарчага механізма ў лёгкай прамысловасці рэспублікі. Прадпрыемствы гэтай галіны першымі ў краіне пачалі апрабоўваць другую мадэль гасразліку, заснаваную на нарматыўным размеркаванні валавога даходу. Калі гаварыць коратка, то ва ўмовах гэтай мадэлі вытворчыя калектывы пакідаюць у сябе тую частку заробленага прыбытку, якая застаецца пасля вызначаных адлічэнняў у бюджэт і міністэрству, разлікаў з пастаўшчыкамі, усіх абавязковых плацяжоў і штрафаў. За кошт гэтага і фарміруюць свае фонды.

— У Мінлегпроме рэспублікі другая форма гаспадарчага разліку прынесла прыкметныя перамены да лепшага. Здавалася б, ёсць нядрэнныя практычныя вынікі і нікога не трэба агітаваць за прагрэсіўны метад гаспадарання. Але кіраўнікі прадпрыемстваў асцярожнічаюць, не спяшаюцца падымацца на больш высокую ступень гасразліку. У чым тут справа?

— Апасенні работнікаў вытворчасці звязаны перш за ўсё з тым, што другая гасразліковая форма адносін больш рызыкоўная: можа здарыцца так, што калектыву пасля ўсіх разлікаў і плацяжоў не хопіць сродкаў на выплату заработнай платы. Гарантавацца яна можа толькі ў выпадку эфектыўнай работы. Не ўсе ў нас псіхалагічна гатовы да такой гаспадарчай дзейнасці, калі можна атрымліваць добры прыбытак, але можна і абанкруціцца.

Ёсць і іншыя прычыны, якія стрымліваюць паглыбленне гасразліку. У сур'ёзнай супярэчнасці з самой сутнасцю другой мадэлі гасразліку знаходзіцца дзеючая сёння сістэма аплаты працы і стымулявання рабочых і спецыялістаў. Яна празмерна ўскладнена, заблытана, прывязана да малазначных паказчыкаў, а таму і слаба зразумелая работнікам. Каб разлічыць, скажам, зарплату работніцы тэкстыльнага камбіната, трэба правесці па меншай меры 25 разлікова-ўліковых аперацый. Характэрна, што больш палавіны з іх не мае якога-небудзь сацыяльна-эканамічнага сэнсу.

— Ці можна сказаць, што даволі ўстарэлая сістэма перашкаджае ўкараненню прагрэсіўных форм арганізацыі і аплаты працы, цягне нас назад, да ўраўнілаўкі і ў канчатковым выніку стрымлівае асабістую ініцыятыву працаўнікоў, рост прадукцыйнасці?

— Так яно і ёсць. Завалы тут неабходна расчышчаць неадкладна. Канкрэтныя прапановы ў нас ёсць. Праўда, для іх выкарыстання трэба захаваць дзве папярэднія ўмовы. Па-першае, прытрымліваючыся літары і духу Закона аб дзяржпрадпрыемстве, трэба ператварыць сённяшнюю тарыфную сістэму з абавязковай у рэкамендацыйную. Па-другое, спецыялісты па працы і фінансах са строгіх ахоўнікаў архаічных інструкцый, палажэнняў і ўказанняў павінны стаць іх разумнымі разбуральнікамі і стваральнікамі эфектыўнай і дакладнай аплаты працы за канчатковы вынік.

— У друку многія крытыкуюць нарматыўныя суадносіны прыросту прадукцыйнасці працы і заработнай платы, якія захаваліся ва ўмовах гасразліку. Іх абаронцы б'юць на тое, што калі ліквідаваць гэты бар'ер, то работнікам пачнуць плаціць незаробленыя грошы, іншымі словамі, не забяспечаныя таварнай масай. А як лічыце вы?

— Рызыкну выказаць «крамольную» думку, але [illegible]о можна лёгка даказаць. Нарматыўн[illegible]/адносіны, аб якіх вы гаворыце, ва умовах поўнага гасразліку з'яўляюцца шкоднымі бюракратычнымі забабонамі. Калі вы глянеце на статыстычныя даныя ўсіх развітых краін свету за апошнія два дзесяцігоддзі, то выявіце апераджаль[illegible]прырост сярэдняй зарплаты над п[illegible]укцыйнасцю працы. Гэта цалкам вытлумачваецца эканамічна. Больш таго, мне думаецца, што гэта эканамічная заканамернасць, якую, на жаль, мы паставілі з ног на галаву. Хіба можна лічыць нармальным, што ў той жа лёгкай прамысловасці паводле дзеяння гэтых суадносін аказаліся зарэзерваванымі дзесяткі мільёнаў рублёў фонду зарплаты. Гэта пры тым, што трэба вырашаць задачы па павышэнню якасці тавараў, павелічэння дзіцячага і маладзёжнага асартыменту, здымаць вастрыню кадравай праблемы ў галіне. Па статыстыцы, работнікі Мінлегпрома па ўзроўню сярэдняй зарплаты займаюць адно з апошніх месцаў у прамысловым комплексе рэспублікі.

Так што для ўмоў другой формы гасразліку гэтыя суадносіны, па-мойму, непрымальныя.

— Макс Самуілавіч, выкарыстанне якіх рэзерваў вытворчасці вы звязваеце перш за ўсё з развіццём другой формы гасразліку?

— З пераадоленнем усё яшчэ існуючай незацікаўленасці прадпрыемстваў у фарміраванні напружаных планаў. Гэта галоўнае. Прычынныя сувязі я бачу тут у тым, што дзяржзаказ у розных яго варыяцыях, а таксама ўсемагчымыя заданні рэспубліканскіх і мясцовых органаў не пакідаюць працоўным калектывам свабоды манеўру ў рэалізацыі прадукцыі, уключаючы пастаўкі на экспарт. Гэта магчымасць з'яўляецца толькі пры перавыкананні планаў. Адсюль і імкненне да іх заніжэння.

Думаецца, нам трэба ў поўнай меры скарыстаць ленінскую ідэю аб харчпадатку і ўстанавіць для прадпрыемстваў стабільныя нарматывы на тую частку аб'ёмаў вытворчасці, якую прадпрыемствы маюць права рэалізаваць самі. Ніхто, ні зверху, ні збоку, ніякі орган кіравання не павінен замахвацца на гэта яго права.

Нельга абысці ўвагай і такое пытанне, як удасканаленне нарматываў розных плацяжоў і размеркаванне гасразліковага даходу. Яны яшчэ не забяспечваюць супадзенне інтарэсаў працоўных калектываў і дзяржавы, а значыць, робяць яшчэ слабы ўплыў на паскарэнне.

Пакажу на прыкладзе. Калі мы вырашылі, што вырабы для дзяцей і асоб пажылога ўзросту павінны быць больш танныя і калі мы хочам рэальнага гасразліку, то ў нас няма другой альтэрнатывы, як прыняць у якасці крыніцы пакрыцця нявыгаднасці гэтых тавараў дзяржаўны бюджэт. Перакладзіце гэтую таннасць, а значыць, нявыгаднасць на плечы гасразліковых прадпрыемстваў — пачнецца вымыванне таннага асартыменту. Што ў нас, дарэчы, актыўна і [illegible]ваецца. Калі аддаць датацыі ў цэнтр[illegible]заваныя фонды міністэрстваў — пачнецца торг наконт фондаў, расцвіце бюракратызм, магчыма, нават карупцы[illegible] але дзіцячага асартыменту не будзе.

Я бачу адзіны шлях: рэалізавала прадпрыемства танны асартымент — страта нармальнага даходу павінна кампенсавацца альбо змяншэннем плацяжоў у бюджэт, альбо льготным падаткам з абароту, альбо датацыяй з бюджэту. Прычым адбываецца ўсё гэта аўтаматычна, праз прамыя сувязі: прадпрыемства — мясцовы фінансавы орган — банк. Мне ўяўляецца, што і па дзіцячых таварах могуць прымяняцца дагаворныя цэны. Занадта ж няпростая ў нас у народнай гаспадарцы сітуацыя.

Што тычыцца ўнутрывытворчага гаспадарчага разліку, то ў рэспубліцы гэтая работа таксама паступова разгортваецца. Тут даводзіцца пераадольваць стэрэатыпнасць і паказуху, паколькі многія кіраўнікі па звычцы спяшаюцца адрапартаваць, не ўкараніўшы рэальнага гасразліку. Тут патрэбны арэндны падрад, прычым прывязваць стымуляванне працы мэтазгодна толькі да якасці, колькасці працы і рэсурсазберажэння. Унутрывытворчы гасразлік павінен быць цалкам простым і зразумелым рабочаму чалавеку.

І некалькі слоў па ўліку. Па тым, як ён пастаўлены, можна дыягнаставаць любую гаспадарку. Калі метад гаспадарання камандна-адміністрацыйны, то ўлік заўсёды «унтэр-прышыбееўскі»: чаго трэба? Калі гутарка ідзе аб эканамічных метадах, то ўлік — самае дакладнае люстэрка. Гэта тонка разумеў У. І. Ленін, неаднаразова паўтараючы: «Сацыялізм — гэта ўлік».

Між тым, тут у нас вялікія завалы. Адзін прыклад. Калі мы сутыкнуліся з праблемамі ўліку, я паехаў у Маскву і папрасіў у бібліятэцы імя У. І. Леніна першы падручнік па бухгалтарскаму ўліку, выдадзены ў нашай краіне пасля рэвалюцыі. Мне далі зборнік пад рэдакцыяй прафесара Венцэля, выдадзены ў 1918 годзе. Дык вось, калі я супаставіў яго змест з сучаснымі падручнікамі, то вялікага прагрэсу не знайшоў.

Пасля доўгіх перагавораў з Мінфінам рэспублікі і краіны зацверджана нарэшце новая інструкцыя па ўліку, якая адлюстроўвае другую форму гасразліку.

Гэта толькі малая крыха праблем, якія тычацца перспектыў развіцця і паглыблення гаспадарчага разліку ў прамысловасці, у прыватнасці, другой яго мадэлі.

Гутарыў В. ДЗМІТРЫЕЎ.

ПРАЦУЕ ПРЭС-ЦЭНТР САВЕЦКАГА ПАРЛАМЕНТА

Лагічным працягам летніх дыскусій стала другая (асенняя) сесія Вярхоўнага Савета СССР у Маскве. На яе разгляд вынесены цэлы пакет праектаў важных законаў. Адсюль і вялікая цікавасць да працы сесіі з боку савецкай і замежнай прэсы. Прэс-цэнтр акрэдытаваў на ёй 750 савецкіх і амаль 300 зарубежных журналістаў. Сярод іх—карэспандэнты з Вялікабрытаніі, ФРГ, ЗША, Японіі.

Прэс-цэнтр Вярхоўнага Савета СССР аказвае ўсялякае садзейнічанне савецкім і замежным карэспандэнтам. Гэта і індывідуальная дапамога журналістам у арганізацыі інтэрв'ю дэпутатаў, і забеспячэнне іх бюлетэнямі стэнаграфічных справаздач пленарных пасяджэнняў, законапраектамі, графікамі работы сесій, камітэтаў і камісій, іншай даведачнай літаратурай.

Перад пачаткам сесіі савецкія і замежныя карэспандэнты былі азнаёмлены з яе праграмай на прэс-канферэнцыі старшыні Савета Нацыянальнасцей Р. Нішанава. Пасля заканчэння сесіі плануецца правесці прэс-канферэнцыю першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета СССР А. Лук'янава.

У ходзе сесіі для журналістаў былі арганізаваны «круглыя сталы» па нацыянальнай платформе КПСС з удзелам народных дэпутатаў, па экалогіі, па пытаннях барацьбы са злачыннасцю. У час пасяджэнняў камітэтаў і камісій (а яны праходзяць па серадах, чацвяргах і пятніцах) арганізуюцца рабочыя сустрэчы журналістаў і дэпутатаў, якія ў шчырай гутарцы могуць падрабязна абмеркаваць любыя цікавыя для іх пытанні.

Прэс-цэнтр яшчэ не мае сваіх рабочых памяшканняў. Наваселле чакаецца к канцу года. У цэнтры Масквы на праспекце Калініна пад рабочыя кабінеты членаў Вярхоўнага Савета СССР перадаецца 26-павярховы будынак, дзе раней размяшчаліся Аграпром СССР і Міністэрства каляровай металургіі СССР, якія цяпер ліквідаваны. Тут жа размесціцца і прэс-цэнтр. Для правядзення вялікіх прэс-канферэнцый адводзіцца канферэнц-зала на 720 месцаў, для брыфінгаў—зала на 125 месцаў. Побач плануецца абсталяваць памяшканне для работы журналістаў.

Пакуль жа прэс-цэнтр дзейнічае ў будынку Вярхоўнага Савета СССР. У параўнанні з прэс-цэнтрамі замежных парламентаў, дзе колькасць работнікаў іншы раз даходзіць да ста чалавек, ён пакуль нешматлікі—усяго шэсць чалавек. З расшырэннем праграмы работы прэс-цэнтра павялічыцца і яго штат. Адпаведна будзе паляпшацца і журналісцкі сервіс акрэдытаваных пры Вярхоўным Савеце СССР савецкіх і замежных карэспандэнтаў.

Валянцін КУЛІКОЎ.

РЫХТУЕЦЦА ДА ВЫДАННЯ

ГАРАДОК МАЙСТРОЎ

[Заканчэнне. Пачатак у № 46].

У цэнтральнай частцы Ракава сям-там стаяць і аднапавярховыя мураванкі. Калі невысокія, у дзве-тры прыступкі ганкі такіх будынкаў глядзяць непасрэдна на вуліцу, не сумнявайцеся: перад вамі былыя рамесніцкія майстэрні дробных гандляроў... Шмат чаго памятаюць ракаўскія вулачкі. Сюды, напрыклад, часта наведвалася вядомая польская пісьменніца Эліза Ажэшка (1841—1910 гады жыла на Беларусі). Яна спынялася ў мясцовага памешчыка, прафесара-філолага Мар'яна Здзяхоўскага (1861—1938)*, з захапленнем удзельнічала ў гарачых спрэчках, інтэлектуальных гутарках і таму, мабыць, нават назвала Ракаў «беларускімі Афінамі». Добра ведаў Ракаў пачынальнік новай беларускай літаратуры Вінцук Дунін-Марцінкевіч (1807—1884), мікраскапічны маёнтак якога Люцінка знаходзіўся непадалёку. Звязана наша мястэчка і з лёсам Янкі Купалы: у фальварку Паморшчына нейкі час працаваў беззямельны арандатар Дамінік Луцэвіч — бацька паэта.

Не трэба думаць, што цішыня і спакой заўсёды непадзельна панавалі ў мястэчку. Яно абуджалася, віравала не толькі ў кірмашовыя дні, што супадалі звычайна з храмавымі святамі, калі тут наладжваліся ўрачыстыя фэсты, на змену якім прыходзілі вясёлыя народныя гулянні. Бачылі вуліцы Ракава і ўзбуджаныя натоўпы дэманстрантаў пад чырвонымі сцягамі. У перыяд Першай расійскай рэвалюцыі гэта ў пэўнай ступені з'явілася вынікам прапаганды беларускіх сацыял-дэмакратаў. Захаваўся, у прыватнасці, адзін з сакрэтных рапартаў мінскага павятовага спраўніка губернатару, датаваны 1906 годам. «28 жніўня, — чытаем у дакуменце, — трыма невядомымі маладымі людзьмі, што ехалі дарогаю з мястэчка Валожына... да Ракава... раскіданы былі антыўрадавыя брашуры і пракламацыі». Паліцыя неўзабаве схапіла гэту групу рэвалюцыянераў. Пры вобыску ў іх знайшлі адозвы Мінскай групы РСДРП, друкаваныя працы К. Маркса і Ф. Энгельса. Мястэчкоўцы неаднойчы згуртавана выходзілі на вуліцы і пазней, каб пратэставаць супраць беспрацоўя, дарагоўлі, класавага і нацыянальнага прыгнёту — нязносных умоў, што былі горкай явай не толькі Ракава, а і ўсёй астатняй Заходняй Беларусі, якая ледзь не цэлае дваццацігоддзе жыла ў польскім падняволлі.

Паводдаль ад Праабражэнскай царквы ў неба ўзносяцца вастраверхія шпілі касцёла. Ён вырас на пачатку нашага стагоддзя. Цяпер тут завіхаюцца рэстаўратары, а яшчэ не так даўно храм выкарыстоўваўся... пад сховішча кармоў для індустрыяльнай птушкагадоўлі, якая, дарэчы, паспяхова развіваецца ў Ракаве. Як бачым, пазітыўныя зрухі ёсць, і змена стаўлення да нацыянальнай спадчыны (у тым ліку і да спадчыны культавай) — адна з прыкметных станоўчых рыс апошняга часу. У адрэстаўрыраваным касцёле, дзе цудам зберагліся дэталі разнога інтэр'ера, запланавана стварыць залу арганнай музыкі. Рашэнне, безумоўна, добрае. Але ці самае разумнае? Відаць, не, бо шматлікая тутэйшая каталіцкая паства не мае, па-сутнасці, магчымасці належным чынам святкаваць кананічныя набажэнствы: невялікая капліца, якую мы ўжо бачылі, часта не ўмяшчае ўсіх веруючых. Ды і не прыдатная яна для большасці ўрачыстых каталіцкіх рытуалаў. Калі ж касцёл пасля рэстаўрацыі вернуць веруючым, дык і арган там абавязкова загучыць. А дзверы беларускіх храмаў адвеку адчынены ўсім — заходзь, глядзі, слухай і думай...

* Аўтар нядаўна знайшоў архіўную справу, дзе зафіксавана, што бацька М. Здзяхоўскага падтрымліваў паўстанцаў 1863 года, але даказаць гэта на неабвержных фактах улады не змаглі, і гаспадар ракаўскага маёнтка пазбег пакарання, хоць падазрэнні супраць яго засталіся.

...Побач з касцёлам самавіта стаіць нетыповы, з высокім ганкам прасторны будынак. Падмуркі і першы паверх — з абчэсанага валуновага каменю. Мясцовыя краязнаўцы паведамілі, што гэта былая пошта, ці, як пісалі даўней, «паштовая станцыя», якая распачала адлік другому стагоддзю сваёй гісторыі. Яна добра захавалася, цяпер тут жывуць некалькі сем'яў. Але колішняе казённае памяшканне мала падыходзіць для сучаснага жытла. Яно нібыта само напрошваецца, каб тут у будучыні стварылі гісторыка-этнаграфічны музей Ракаўшчыны. Старая ракаўская пошта, дарэчы, даўно заслугоўвае, каб яе ўзяла пад дбайную ахову дзяржава: сюды пісалі жыхарам сваякі з самых розных куткоў краю і свету, адсюль падтрымліваліся паштовыя зносіны, без якіх цывілізаванае жыццё цяжка ўявіць. Сярод адрасатаў, што атрымлівалі карэспандэнцыю з Ракава, былі, між іншым, асобы выдатныя і сусветна вядомыя. Так, напрыклад, з мясцовай «станцыі» ў жніўні 1895 года прафесар Здзяхоўскі накіраваў у Ясную Паляну Льву Талстому ліст з прапановай напісаць прадмову да аднаго са сваіх навуковых твораў, выдадзеных бесцэнзурна за мяжою. У тыя часы Талстому няспы[illegible]най плынню ішлі тысячы пас[illegible]яў і пераважная большасць, [illegible]атуральна, заставалася без адказаў. А вось ракаўская карэспандэнцыя не пакінула вялікага [illegible]ісьменніка раўнадушным. З[illegible]лося аж чатыры варыянты [illegible]рунтоўнага ліста Здзяхоўскаму, чыставую копію з апошняй рэдакцыі ў верасні атрымалі чыноўнікі ракаўскай «станцыі», каб уручыць адрасату.

...Гадоў 5 назад, рыхтуючыся да сваёй першай краязнаўчай вандроўкі ў Ракаў, аўтар па розных крыніцах вывучаў мясцовыя помнікі і памятныя мясціны. Цяпер падобная задача вырашылася б куды прасцей, бо толькі па Мінскай вобласці (яна займае значную частку былой аднайменнай губерні) убачылі свет два капітальныя, акадэмічныя тамы «Помнікаў гісторыі і культуры Беларусі». А тады, згадваецца, не без цяжкасцей склаўся кароткі пералік таго, на чым абавязкова трэба ў Ракаве спыняць увагу. Але варта было прыехаць і трохі тут паблукаць, каб канчаткова ўпэўніцца, што на самай справе ракаўскай спадчыны засталося куды больш за сабраныя, вельмі сціплыя, занадта фрагментарныя звесткі. Нечаканасці быццам знарок падпільноўвалі аўтара ледзь не на кожным кроку. Помніцца, у самым канцы мая (якраз красаваў бэз), пастаяўшы ля абеліска на брацкай магіле 45 воінаў Савецкай Арміі і партызан, якія загінулі летам 1944-га пры вызваленні гэтага кутка Бацькаўшчыны, наважыўся ісці ў цэнтр былога мястэчка, каб тым разам ужо развітацца з Ракавам. Але на Чырвонаармейскай вуліцы трапілася такое, што адразу змусіла спыніцца: белы цагляны домік прыляпіўся да несумненна, старадаўняга, без вокнаў трывалага збудавання, складзенага з дзікіх валуноў. «Што ж рабіць?.. Адказ трэба, відаць, паспрабаваць пашукаць на сядзібе», — думалася прыкладна так, калі рука міжвольна пацягнулася да брамкі. Сустрэў сівенькі, крыху прыгорблены дзед з добразычлівым адкрытым тварам. Як высветлілася, гаспадар, Барыс Курыла. Ён ахвотна паведаміў, што незвычайны будынак з каменю — колішняя памешчыцкая лядоўня, ці, ужываючы сучасныя паняцці, халадзільная камера, пад якой да таго ж глыбокі мураваны склеп. Лядоўня тут, тлумачыў далей гаспадар, яшчэ з часоў паншчыны. Звычайна на зыходзе зімы сюды складалі ледзяныя брусы, каб аж да позняй восені, да новых халадоў захоўваць свежае мяса, рыбу, розныя «каланіяльныя тавары» (тады дзікоўныя, простым людзям невядомыя і недаступныя заморскія ласункі: апельсіны, бананы, ананасы). Карцела ў што б там ні стала хоць адным вокам зазірнуць у лядоўню, бо прадчувалася, што можна ўбачыць нешта унікальнае. Стары, улавіўшы настрой госця, запрасіў. Чаканні не падманулі: у дальнім куце — абсалютна спраўная зернеачышчальная машына, альбо, як тут кажуць, «арфа» — адна з тых, што праславілі ракаўскіх майстроў яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Ужо ў Мінску, з энцыклапедычнага «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы», аўтар даведаўся, што рэліктавы цяпер дзеяслоў «арфаваць» азначае: «чысціць арфай зерне ад мякіны і смецця». Дарэчы, гэтай самай арфай маладыя сваякі дзеда Курылы з поспехам карыстаюцца па сённяшні дзень,

Што і казаць, умелі працаваць славутыя ракаўскія майстры! Расказ пра іх не атрымаецца поўным без наведання грамадскага музея пры мясцовай сярэдняй школе, створанага, па сутнасці, адным апантаным чалавекам — гісторыкам-краязнаўцам, былым партызанам, настаўнікам Васілём Налецкім.

Давайце разам зойдзем у музей. Паводле мерак госця з вялікага горада, зусім недалёка: у Ракаве, як і ў кожным былым нашым мястэчку, любы канец не за гарамі... Крочым па нешырокай (без асфальту) вулачцы, пачатак якой ледзь уціскаецца між капітальнымі мурамі касцёльнага паркана і «паштовай станцыі». Дарожка патроху раздаецца, паказаліся новабудоўлі — самавітыя, з цёсу, які пахне духмянай жывіцай (стукні па бервяне — зазвініць), дамы, сучасных памераў вокны іх так і ззяюць пад сонцам. Вось драўляны масток праз Ісलач. Адсюль адкрываецца цудоўная па сваёй непаўторнай чароўнасці панарама: на фоне лясістага адхону левабярэжжа і маляўнічых, зацягнутых хісткім чаротам затох правага берага — высокае тысячагадовае гарадзішча і вялізныя курганы. Помнікі ўражваюць, неспецыялісту цяжка ўявіць і, зразумела, паверыць, што шмат стагоддзяў назад яны насыпаны продкамі без аніякіх механізмаў і прыстасаванняў, аднымі голымі рукамі.

Музей займае куток у памяшканні школы. Не будзем засяроджваць увагу на экспанатах, якія прынята лічыць «звычайнымі»: на грамафоне, на пашыраным даўней у кожнай вясковай і местачковай беларускай хаце начынні, на старых фотаздымках. У асноўным нас цікавіць тут тое, што гаворыць пра слынных ракаўскіх майстроў. З арфай, якая была галоўнай прадукцыяй тутэйшага «машынабудавання», мы ўжо збольшага пазнаёміліся. Цяпер спынімся на народным ганчарстве, якое доўгі час жывіла гэты край, было другой важнай галіной ракаўскай рамесніцкай вытворчасці.

Спачатку — кароткая даведка, невялічкі экскурс у гісторыю.

...Адметная ракаўска-івянецкая ганчарная школа пачала складацца ў канцы XVIII стагоддзя. Тут з'явіліся цэлыя працоўныя дынастыі майстроў. Гісторыя нават захавала нам іх імёны: Аляшкевічы, Гурыновічы, Каласоўскія, Петрашкевічы, Шыбіцкія. Неўзабаве да іх далучаюцца прозвішчы Ануфрэвічаў, Жылінскіх, Макуцкіх, Маўчановічаў, Латышоў, Падліпскіх, Сасноўскіх, іншых. Ракаўскія ганчары ганарыліся сваімі вырабамі, бо ўкладалі ў іх душу. Адзін майстар, напрыклад, з годнасцю вывеў своеасаблівы эталон якасці на паверхні сырога яшчэ, непрапечанага гарлача: «Року 1841 Вінцэнт Ануфрэвіч стварыў». Тутэйшыя ганчары дасягнулі высокага прафесійнага майстэрства і паступова трывала ўкараніліся на кірмашах усяго беларускага краю. Але яны не спыняліся на дасягнутым, паспяхова засвоілі тэхніку паліваных рэчаў першай жыццёвай неабходнасці (сталовы і гігіенічны посуд, цацкі, іншае), што прызначаліся як небагатым гараджанам і местачкоўцам, так і сялянам. Нішто як быццам не азмрочвала светлых даляглядаў развіцця мясцова[illegible]нчарства, але дакументы [illegible]двухсэнсава сведчаць, што сітуацыя складалася не зусім так. Давайце пагартаем «Памятную кніжку Мінскай губерні на 1910 год», якая экспануецца ў школьным музеі. Знахо[illegible] патрэбнае: «У мястэчку [illegible]аве Мінскага павета заслугоўвае ўвагі вытворчасць драўляных малатарняў і веялак... малатарні прадаюцца па 70—110 рублёў, а веялкі — па 20—35 рублёў і даражэй. Ганчарная прамысловасць пашырана пераважна ў мястэчках Ракаве і Івянцы... цэны на саматужныя вырабы невысокія».

Дасведчаныя аглядальнікі, а ў іх пад рукамі меліся дакладныя справаздачы з валасцей і паветаў усёй Мінскай губерні) не выпадкова паставілі ракаўскае ганчарства на другое месца, падкрэслілі таннасць прадукцыі: яно пачало страчваць гарадскога і замежнага местачковага пакупніка, здавала адну пазіцыю за другой у няроўнай канкурэнтнай барацьбе з тыражыраванымі вырабамі масавай вытворчасці капіталістычных фарфоравых і фаянсавых фабрык. Ганчарам заставалася працаваць, арыентуючыся ўжо толькі на беларускую вёску. Формы вырабаў ракаўскіх майстроў сталі яшчэ больш нагадваць узоры беларускай народнай разьбы па дрэву, пластычныя матывы мастацкага кавальства і ліцця. Сяляне з ахвотай упрыгожвалі свае хаты адмысловымі ракаўскімі салатнікамі, міскамі, талеркамі, кубкамі. Асаблівай папулярнасцю карысталіся невялікія гаршкі са шчытнымі накрыўкамі, злучаныя між сабой уверсе дугой, — «спарышы» (у іх насілі ў поле простыя сялянскі харч — крупнік ці клёцкі і кашу), цацкі (тут, у музеі, ёсць самы, бадай, характэрны мясцовы цацачны выраб — дабрадушны леў), гарлачы-малочнікі (іх таксама знойдзеш у экспазіцыі).

Але ўсё гэта мала садзейнічала пашырэнню і росквіту ганчарнага рамяства. Прыбыткі часта цалкам паглыналіся непазбежнымі выдаткамі (ганчары мусілі раскашэльвацца на набыццё дарагіх тады хімікатаў для палівы, плаціць за дазвол займацца прафесійнай дзейнасцю, сплочваць дзяржаўныя падаткі, уносіць плату за арэнду сядзібнай і ворнай зямлі, дзяліцца часткай прыбыткаў з аптовымі гандлярамі).

Калі ракаўскія майстры-ганчары ў пачатку стагоддзя апынуліся ў даволі складаным становішчы, дык тутэйшыя рамеснікі іншых спецыяльнасцей не маглі паскардзіцца на спад попыту. У мястэчку сталі нават мэтанакіравана рыхтаваць новыя кадры. Чытаем на музейным стэндзе адзін з матэрыялаў «Нашай нівы» (1908 год, № 18, 28 верасня): «У мястэчку Ракаве Мінскага павета ёсць рамесніцкая школа, — паведамляе рэдакцыі нехта Янук Б.,—грошы на яе дае земства... Школа стараецца праз 4 гады навучыць хлопцаў слясарцы, сталярству, кавальству; таксама вучаць будаваць добрыя хаты, рабіць плугі, малатарні, арфы, касілкі... Хто скончыць ракаўскую школу, той можа неісці на фабрыку, а застацца ў роднай вёсцы — работы шмат знойдзецца, дый другіх людзей навучаць свайго майстэрства».

...Падчас наведванняў Ракава неяк заўсёды шанцавала на знаёмствы з цудоўнымі людзьмі, сапраўднымі майстрамі, паэтамі, калі хочаце, сваёй справы. Абысці адну з такіх проста грэх, бо яна яркай ніццю сама ўплятаецца ў сувой папярэдняга зместу. Было так. Аднойчы В. Налецкі паведаміў: у Ракаве яшчэ жывы адзін з прадстаўнікоў даўней слынных тутэйшых ганчароў — Станіслаў Жылінскі. Мігам згадалася дата першага дакументальнага ўпамінання гэтага «ганчарнага» прозвішча, атрымалася, што працоўная дынастыя ракаўскіх ганчароў Жылінскіх мае ўжо амаль цэлых два стагоддзі!

Шмат гаварыў стары майстар пра мясцовае ганчарства. Пачапіўшы на нос круглыя, несучасныя акуляры, ён з алоўкам у руках пералічыў 20 самых знакамітых ганчароў-рамеснікаў, якія працавалі тут між дзвюма сусветымі войнамі. З усмешкай удакладніў, што ў тую пару для ганчароў склалася спрыяльная, на першы погляд, сітуацыя. Іх прадукцыя карысталася шырокім і надзейным попытам, бо цэны на ўсе без выключэння прамысловыя вырабы былі астранамічна высокія (звычайны веласіпед, напрыклад, каштаваў столькі ж, колькі 5—6 добра ўкормленых свіней). Большасці насельніцтва Заходняй Беларусі стаў не па кішэні і фабрычны посуд. Але дарагоўля і масавае, хранічнае беспрацоўе няспынна шырылі паўсюдную галечу, калі просты люд, перабіваючыся з хлеба на квас, тужэй і тужэй зацягваў паясы і ледзь зводзіў канцы з канцамі. Даводзілася, успамінаў ганчар, на кірмашах проста абменьваць жбанкі, слоікі, гарлачы (уласныя вырабы ён ласкава зваў «штукамі») на бульбу, яблыкі, яйкі, бо ў пакупнікоў не мелася нават некалькіх злотых.

...Любой парой хараша ў Ракаве. Наша мястэчка не страціла непаўторнага ўласнага гістарычнага аблічча, бо новыя грамадскія будынкі (школа, гандлёвы цэнтр, кінатэатр, пошта, выканком мясцовага Савета народных дэпутатаў) арганічна спалучаюцца са старой, традыцыйна-беларускай местачковай архітэктурай. Нішто не азмрочвае лірычнасці, задушэўнай маляўнічасці кожнага ракаўскага кутка. Асабліва цудоўна тут вясною, калі вернуцца дамоў шпакі, калі цыбатыя буслы ўлаштуюцца на макаўках разгалістых дрэў, а зялёная зямля з палёгкай задыхае свежасцю пасля цёплых майскіх ліўняў.

Звычайна да сярэдзіны мая ля кожнага дома зацвітаюць сады, загараюцца чырванню півоні ў гародчыках, а ласкавую ранішнюю цішыню парушаюць толькі задзірыстыя пеўні.

Хіба можна не любіць гэтыя чароўныя беларускія мясціны, якія, да таго ж, здавён-даўна славяцца сваімі майстрамі!

Мар'ян ВІЖ.

ГРАЖДАНСКАЯ ВОЙНА ИЛИ ГРАЖДАНСКИЙ МИР

УПУЩЕННЫЕ АЛЬТЕРНАТИВЫ РОССИИ

I.

Социалистическая революция в России в октябре 1917 года по-прежнему остается главным событием текущего и теперь уже быстро убывающего столетия. Свершилась она бескровно, принеся обездоленным надежду быстро улучшить свою жизнь. Революция была закономерна и вызвана необходимостью решить противоречия, раздиравшие Россию, мешавшие ее продвижению вперед. Она шла под демократическими лозунгами: «Власть Советам!», «Земля — крестьянам!», «Мир — народам!». И была восторженно поддержана большинством населения страны. Но наступил ее второй день...

«Люди, хвалившиеся тем, что **сделали** революцию, всегда убеждались на другой день, что они не знали, что делали,— писал в свое время Ф. Энгельс, — что **сделанная** революция совсем непохожа на ту, которую они хотели сделать. Это то, что Гегель называл иронией истории...» Большевики вершили революцию, зная, чего они хотят. Они создавали государство диктатуры пролетариата, и в этом классовом государстве многим демократическим учреждениям не оказалось места.

Незадолго до октября 1917 года В. И. Ленин, обобщая опыт борьбы с контрреволюцией, попытками установления военной диктатуры, писал: «Если есть абсолютно бесспорный, абсолютно доказанный фактами урок революции, то только тот, что исключительно союз большевиков с эсерами и меньшевиками, исключительно немедленный переход всей власти к Советам сделал бы гражданскую войну в России невозможной». Почему же гражданская война в России все же разразилась?

В советской науке давно сложилось мнение о том, что гражданская война не есть непременная спутница социалистической революции. Быть ей или нет — зависит от многих конкретно-исторических обстоятельств. Пришедшие к власти большевики шли на коалицию с другими партиями при условии признания их программы действий, социалистические партии, стоявшие правее, отстаивали свои позиции. Но так как они отвергли условия большевиков, то и взяли на себя ответственность за развязывание гражданской войны, более того, сами стали ударным отрядом «демократической контрреволюции» в России. Наиболее четко эта позиция высказана известным советским историком Павлом Волобуевым.

Несколько иную позицию занял писатель Борис Васильев и другие. Рассуждая о начале гражданской войны в России, ее причинах, он писал: «Я думаю, имея в виду разгон Учредительного собрания (парламентского учреждения), что ночь с 5 на 6 января 1918 года — начало размежевания России и завтрашней гражданской войны, рубеж между Законом и Чрезвычайкой, между Согласием и Конфронтацией. И дело совсем не в том, можно ли было тогда поступить по-иному; дело в первом применении силы при решении вопросов общенационального политического устройства. Гуманистическая тенденция раз[illegible] России, начатая бескро[illegible] революцией и рассчитанная на духовное и материальное обогащение, отныне была прервана».

Почему же не состоялась коалиция большевик[illegible] с эсерами (социалисти[illegible]-революционная партия) [illegible]еньшевиками (реформистское крыло в революционном движении), почему было разогнано Учредительное собрание и не предотвращена война, приведшая к огромным бессмысленным жертвам и разрушениям и к эмиграции из страны более 2 миллионов человек?

Еще до октября 1917 года у левых эсеров и меньшевиков-интернационалистов возникла идея создания в России «однородного социалистического правительства». Они предлагали заменить им третье коалиционное правительство Керенского. Но грянуло победоносное вооруженное Октябрьское восстание. На 2-м Всероссийском съезде Советов 25 октября в начале работы были большевики, меньшевики и эсеры. Но правые эсеры после обмена мнениями ушли, а левые ответили отказом на предложение войти в состав формируемого советского правительства. В него вошли большевики — сторонники вооруженного захвата власти и те, кто тяготел к компромиссу с другими социалистическими партиями, считая необходимым поделить с ними власть. Эти последние (Л. Каменев, А. Рыков и другие) приняли резолюцию о том, что они за создание правительства из представителей всех социалистических партий и «соглашаются отказаться от кандидатур Троцкого и Ленина, если этого потребуют». На совещании ЦК партии 1 ноября Лев Троцкий выступил против создания такого правительства, так как «партии, в восстании участия не принимавшие, хотят вырвать власть у тех, кто их сверг». Позже Троцкий передал свои воспоминания об этом совещании так: «По вопросу о соглашении Ленин говорил: «А соглашение?» — Я не могу даже говорить об этом серьезно. Троцкий давно сказал, что объединение невозможно. Троцкий это понял, и с тех пор **не было лучшего большевика**». Кончается речь лозунгом: «Без соглашений — за однородное большевистское правительство!» Победила тогда точка зрения Ленина и Троцкого, в правительство чуть позже вошли лишь левые эсеры. В борьбе за власть лидеры большевистской партии были последовательны и непоколебимы, ориентируясь на сохранение в своих руках власти, взятой в ходе революции.

Это проявилось и в истории с разгоном Учредительного собрания. Идея его созыва была одной из самых радикальных и общедемократических в предреволюционное время. Требование его созыва входило в программные документы многих демократических партий, в том числе и в программу-минимум большевиков. Его ожиданием жило население страны после свержения самодержавия, потому и созданное тогда правительство называлось Временным, а 2-й Всероссийский съезд Советов, взявший власть в свои руки, постановил: «Образовать для управления страной, впредь до созыва Учредительного собрания, Временное Рабочее и Крестьянское правительство, которое будет именоваться Советом Народных Комиссаров». Так почему же это собрание просуществовало лишь немногим более двенадцати часов?

К выборам в Учредительное собрание страна готовилась все лет[illegible] в начале осени 1917 года. В[illegible] приняли участие несколько десятков имевшихся тогда в России политических партий и общественных организаци[illegible]боры осуществлялись на [illegible]ове всеобщего, равного, прямого и тайного голосования на альтернативной основе. Состоялись они 12 ноября 1917 года, то есть уже через несколько дней после прихода к власти большевиков.

В результате выборов большевики получили 24 процента голосов, демократические социалистические партии и организации — 62, представители буржуазии и помещиков — 13. Можно говорить о том, что большевики победили на выборах в столице и крупных промышленных центрах, что ко времени выборов еще не везде в стране власть перешла в руки Советов, а их декреты были проведены в жизнь. Но факт остается фактом: среди избранных в Учредительное собрание 715 депутатов, по неполным данным, было 370 эсеров, 175 большевиков, 86 представителей от национальных групп, 40 левых эсеров, 17 кадетов (партия либерально-анархической буржуазии), 15 меньшевиков, 2 представителя трудовой народно-социалистической партии, 1 не назвал своей партийной принадлежности.

В. И. Ленин в то время был за такое Учредительное собрание, которое признает власть Советов, власть Совета Народных Комиссаров. В «Тезисах об Учредительном собрании» он подчеркивал, что «...республика Советов является более высокой формой демократизма, чем обычная буржуазная республика с Учредительным собранием». Когда большинство членов временного бюро большевистской фракции Учредительного собрания (Л. Каменев, В. Милютин, А. Рыков, Д. Рязанов и другие) заняли иную позицию, полагая, что не переход власти в руки Советов, а созыв Учредительного собрания венчает развитие революции, Ленин выступил резко против и потребовал переизбрания бюро.

Алексей ЛИТВИН.
(АПН).

СОВЕТСКИЕ КОММУНИСТЫ ЗА ПЛЮРАЛИЗМ, НО...

НУЖНА ЛИ СЕГОДНЯ МНОГОПАРТИЙНОСТЬ?

Сегодня в СССР можно услышать такие, например, публичные заявления: «Лучшей формы политического плюрализма, чем многопартийная система, человечество не выработало». «Нет, многопартийностью еще не определяется уровень демократизма в обществе, успешное развитие плюрализма мыслимо и без нее». «Однако за возрождение многопартийной системы сейчас выступают целые группы советских людей». «Они весьма малочисленны и не очень влиятельны. Подавляющее большинство общества — за однопартийность, потенции которой не исчерпаны в расширении и углублении социалистической демократии»...

Мы кратко суммировали в виде диалога столкновение различных мнений, которые высказываются отнюдь не только в той или иной узкой, профессионально подготовленной аудитории. К их обсуждению привлекается и самая широкая общественность. Пример — недавний сюжет популярной телепрограммы «Добрый вечер, Москва» — репортаж об открытии дискуссионного клуба при Московском комитете КПСС. На первой же встрече здесь заговорили об отношении коммунистов и беспартийных, включая «неформалов», к идее многопартийности. О том же шла речь и за «круглым столом» ежемесячника «Вопросы истории КПСС». Полемика особенно интересна тем, что в ней участвовали наиболее компетентные специалисты, изучающие теорию и практику обновления КПСС.

Что же показывает анализ дискуссий? Одно из типичных соображений — предположение, что переход к многопартийности помог бы стране скорее выйти из затяжного социально-экономического кризиса, начавшегося еще во времена застоя, и решить многие нелегкие проблемы перестройки. Мол, камень преткновения на пути сдвигов к лучшему — доставшийся от прошлого политический монополизм КПСС, обусловленный ее фактическим срастанием с государственной властью.

Среди доводов против многопартийности — аргумент, что столь радужные упования на нее сродни надеждам отыскать некое универсальное средство от всех болезней. Но расчет на такую панацею от всех бед наивен. Тем более, что их истоки глубже и шире тех, что обнаружены людьми, усматривающими корень зла в политическом монополизме КПСС. В основе лозунга «за многопартийность» — абстрактные и часто идеализированные представления о ее механизме, оторванные от реальности.

Чему учит опыт, допустим, американской двухпартийной политической системы? Для ее устойчивого функционирования надо, чтобы обе соперничающие партии опирались на близкие, совпадающие в главном платформы, но внешне выглядели как бы враждующими и чтобы каждая из них внушала населению, будто приход конкурента к власти чреват едва ли не национальной катастрофой. Перед нами, в сущности, некое подобие однопартийности. При всей разоблачительно-критической риторике «антагонисты» — как бы родные сестры плоть от плоти породившего их общества. Нельзя, конечно, сказать, что они похожи как две капли воды. Но различия имеют свой предел.

Очевидно, что многопартийность даже в классических своих вариантах не безупречна. И вовсе не обязательна для развития демократизма, сама по себе она еще не определяет его уровень. Постоянно действующие силы оппозиции? Но их роль могут успешно играть и при однопартийности авторы критических выступлений в средствах массовой информации, «возмутители спокойствия», особенно бюрократического, консервативно-застойного, «инакомыслящие», помогающие строже оценивать и корректировать, даже отклонять те или иные проекты, решения руководителей любого ранга. Разумеется, в обстановке широкой гласности, дискуссионности, которая утвердилась в СССР сегодня.

А при наличии нескольких партий в стране неизбежно соперничество между ними, которое дорого стоит обществу и материально, и морально, и политически, что особенно опасно на таком крутом повороте истории, как нынешний этап перестройки в Советском Союзе. Борьба за власть между ними может вылиться в конфронтацию, затормозить движение по пути обновления, прервать прогрессивные преобразования. Сегодня, как никогда, нужна консолидация сил, препятствующая размежеванию, расколу. Ее организатор — политический авангард общества — КПСС.

Спору нет, однопартийность часто ассоциируется с чуждыми социализму явлениями, которые десятилетиями не только не преодолевались, но даже не вскрывались, накапливаясь и усугубляя друг друга. Но разве однопартийная система виновата в этих завалах прошлого? Нет, напротив, многие из былых трудностей и бед удалось бы предупредить, если бы заложенные в ней возможности использовались полностью. Корень зла не в отсутствии многопартийности, а в отсутствии всесторонне развитой демократии.

В середине 20-х годов встал вопрос об углублении демократии в обществе, совершенствовании механизмов управления, более полном учете социально-экономических и политических интересов населения. Однако борьба за власть в партийном руководстве после смерти В. И. Ленина помешала этим процессам, не дала им развернуться и перерасти в широкую демократизацию на базе однопартийности. И. В. Сталин сумел подчинить себе партию, сделать ее становым хребтом административно-командной системы. Политический авангард общества подвергся огосударствлению, взял на себя важнейшие функции управления страной, в чем-то подменив и даже поставив под контроль Советы. Вот это издание однопартийности, которую оно компрометировало десятилетиями, ликвидируется ныне благодаря перестройке вместе с прочим недоброй памяти наследием прошлого.

Возможно ли возникновение других партий в Советском Союзе хотя бы в отдаленной перспективе? Не исключено. Но пока особой необходимости в них нет. Впрочем, и в случае появления они, думаем, не смогут всерьез конкурировать с КПСС. Заглядывая в обозримое будущее, лично мы считаем маловероятным формирование иной столь же влиятельной политической силы, как КПСС, которая способна обеспечить стабильность общественной жизни и продолжение перестройки.

Дальнейшее развитие народовластия в СССР вполне возможно в рамках однопартийной системы, на путях ее обновления и совершенствования, приведения в соответствие с новой социально-политической обстановкой. Плюрализм мнений может и должен найти наилучшее выражение в атмосфере самой широкой гласности, дискуссионности, критичности и при одной партии.

Сегодня 20-миллионная КПСС тесно взаимодействует с другими общественными организациями, с различными самодеятельными объединениями, движениями, ведет с ними конструктивный диалог, налаживает сотрудничество. Укрепление таких взаимосвязей под эгидой этого лидера позволяет противостоять идеологической и политической центробежности, тенденциям обособления, отчуждения, сепаратизма.

Глеб ВЫШИНСКИЙ,
Сергей ЦАКУНОВ.

ПРАЙШЛА ПЕРСАНАЛЬНАЯ ВЫСТАЎКА ПАЎЛА МАСЛЕНІКАВА

ПРАЗ ТЭАТР У ВЯЛІКАЕ МАСТАЦТВА

Сярод сучасных дзеячаў культуры рэспублікі добра вядома прозвішча Паўла Масленікава, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР. З энцыклапедыі «Літаратура і мастацтва Беларусі» можна даведацца, што ён педагог. На самай справе гэта не толькі настаўнік, але адзін са стваральнікаў нацыянальнай школы выяўленчага мастацтва. Працаваў рэктарам Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, быў кіраўніком майстэрні тэатральных жывапісцаў, загадчыкам кафедры. Яго актыўны ўдзел у рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках з 1951 года з творамі станковага жывапісу ў сваю чаргу сведчыць: гэта таленавіты пейзажыст. Абарона кандыдацкай дысертацыі «Беларускі савецкі тэматычны жывапіс», сур'ёзная навуковая, творчая, педагагічная работа заўсёды выклікалі ў сучаснікаў здзіўленне, адкуль жа ў яго бяруцца сілы.

Бясцэнную спадчыну—здароўе—атрымаў ён ад бацькоў. Сёлета спаўняецца 75 гадоў з таго часу, калі ў сям'і Васіля і Марылі Масленікавых, якія жылі ў вёсцы Нізкая Вуліца, што знаходзіцца сёння за 14 кіламетраў ад Магілёва, нарадзіўся хлопчык. Бацька цешыўся, што на старасці будзе каму перадаць плуг і касу. Бабуля Мар'я ўпотай марыла, што хлопчык пяройме ад яе таямніцы народнага знахарства. На першым часе ён і рыбак ёй лавіў у Лахве, з жоўці якіх яна рыхтавала лекі для вачэй, і зёлкі дапамагаў збіраць. Але не сельская гаспадарка і не народная медыцына, а гармонія фарбаў, хараство навакольнага свету запаланілі яго дзіцячую душу.

У 1938 годзе П. Масленікаў скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча і пачаў працаваць мастаком-дэкаратарам у Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР. Далей вучыцца змог толькі пасля вайны. З фронта вярнуўся, як кажуць, без адзінай драпінкі, кулі мінулі, а свісталі над яго галавой кожны дзень аж чатыры гады. Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў Ленінградзе скончыў завочна ў 1953 годзе, а праз чатыры гады—аспірантуру пры АН БССР.

Павел Васільевіч прыйшоў у мастацтва як мастак-дэкаратар. Стварыў нямала дэкарацый для тэатраў оперы і балета, імя Янкі Купалы, юнага гледача і іншых. У яго работах упершыню вызначыўся нацыянальны характар беларускай сцэны. Вобразнасць, маляўнічасць яе афармлення, арганічнае спалучэнне музычных і зрокавых вобразаў выклікалі не раз авацыю гледачоў. Як вядома, беларускае тэатральнае мастацтва ў 40—50-я гады прываблівала шмат мастакоў, але толькі П. Масленікаў праз тэатр увайшоў у вялікае мастацтва.

Далёка ззаду засталіся 60-я і 70-я гады, і сёння, у час перабудовы, мы можам уголас гаварыць аб недахопах грамадскага жыцця тых часоў, бюракратызме і дагматызме. Нялёгка было працаваць Паўлу Васільевічу, і мы, сту[illegible]ы, гэта заўважалі. На нашы[illegible]чах яго галава хутка пакрывалася срэбрам. Шмат часу, здароўя адбірала арганізацыйная і педагагічная работа. І, [illegible]валася, для творчасці не м[illegible]о быць ні натхнення, ні запалу, таму для многіх яго знаёмых была неспадзяванкай персанальная выстаўка да 70-годдзя з дня нараджэння. Больш як 300 алейных прац засведчылі вернасць жывапісца рэалістычным традыцыям, у рэчышчы якіх мастак вёў пошукі вобразнай выразнасці і адлюстравання непаўторнага хараства прыроды. На палотнах краявіды Індыі, Егіпта, Швецыі, Францыі, Лівана, Турцыі, Ірана, Украіны, Грузіі, а найбольш, вядома, куточкаў роднай Беларусі.

І вось у верасні ў Палацы мастацтва зноў экспанавалася юбілейная выстаўка, на якой была прадстаўлена 181 работа — карпатлівая праца ў асноўным трох апошніх гадоў. Зроблена нямала. У яго пейзажах — родны край. Купка дрэў, возера, лясная дарога, рэчка, поле, хутарок — тут яго вочы прыкмецілі непаўторнае хараство, а пэндзаль майстра акрэсліў іх паэтычнай прыўзнятасцю і лірызмам.

«Халодны май», «Нарач», «Сонечны сакавік». Мастак адлюстраваў шмат мясцін, дзе пралягалі сцежкі вядомых дзеячаў беларускай навукі і культуры. Тут занатаваны родны кут Якуба Коласа —«Разліў на Нёмане», «Коласаўскі запаведнік»; Янкі Купалы—«Вязынка», «Ляўкі». Твор «На радзіме Ф. Скарыны» прысвечаны беларускаму першадрукару і асветніку Скарыне, які нарадзіўся ў Полацку. На заднім плане бялеюць макаўкі полацкіх сабораў, а далей свецяцца купалы Сафійскага, пабудаванага ў XI—XVIII стагоддзях і адрэстаўрыраванага ў 1985 годзе. На пярэднім плане знявечаны стары дуб. Гавораць, дубы доўга жывуць. То, можа, пад ім адпачываў Скарына? Глядзіш і адчуваеш: блізка тая вясна, калі галінкі дуба не распусцяцца, засохнуць, але на яго месцы не будзе пустэчы, бо маленькія дубочкі густа абступілі яго. Перспектыва твора пабудавана так, што Полацк глядзіцца праз дуб. Тут рэчаіснасць і глыбокая філасофія, а яна невыпадковая. У вольныя часіны мастак знаёміцца з літаратурай па філасофіі ўсіх краін свету, і ў яго асабістым характары выкрышталізаваліся такія станоўчыя чалавечыя рысы, як адкрытасць, чуллівасць, добразычлівасць.

Усе пейзажы мастак напісаў па замалёўках з натуры, нават паспеў зрабіць накіды, калі ў 1948 годзе расцягвалі Мінскае драўлянае замчышча, збіраючыся на гэтым месцы будаваць каменны горад «Менск XII ст.».

— А «Досвітак у Падмаскоўі» таксама намалявалі з натуры?— спытала я.

— Траскучыя саракаградусныя маразы ўеліся ў мае косці і нават сёння ледзяняць душу. Досвіткаў на фронце я добра наглядзеўся, пералівы іх фарбаў запомніў на ўсё жыццё,— такі быў адказ.

Тэмамі сваіх работ мастак нібы адгукаецца на праблемы нашых дзён. Напрыклад, «Ахоўваецца дзяржавай — царква ў Княжыцах». У экспазіцыі ёсць таксама некалькі тэматычных палотнаў «Кастусь Каліноўскі».

Аднойчы пасля заканчэння працоўнага дня, калі зачынілася выставачная зала Палаца мастацтва, я ўбачыла, як Павел Васільевіч сядзеў у глыбокім задуменні. Падышла, запытала, аб чым ён думае. «Мне надта хочацца паказаць свае работы беларусам, якія жывуць за мяжой, — сказаў ён. — Каб яны ўбачылі родныя краявіды, родную зямлю, Радзіму».

Марыя ЖАБІНСКАЯ.

НА ЗДЫМКУ: работа П. МАСЛЕНІКАВА «Нарач».



ДАСЛЕДУЕЦЦА СПАДЧЫНА ПЕРШАДРУКАРА

З ЛІХТАРОМ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

Сёлета беларускае выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла ў свет кнігу гісторыка і публіцыста Аляксея Каўкі «Тут мой народ: Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI—пачатку XX стагоддзяў». Пра нашага асветніка і першадрукара за дзвесце гадоў з'явілася, бадай што, цэлая бібліятэка ў некалькі тысяч публікацый. Пісалі даследчыкі, пісьменнікі, публіцысты-папулярызатары, часам паўтараючы адзін аднаго і толькі зрэдку здабываючы крупінкі новых фактаў пра яго жыццё і творчасць. Так і засталіся пытанні, на якія айчынная і сусветная «скарыніяна» альбо зусім не адказала, альбо адказала прыблізна, няпоўна, часам павярхоўна.

Хто ж такі Скарына і што ёсць яго беларуская Біблія? Ці толькі эпізод у гісторыі станаўлення нацыянальнай культуры? Альбо можа выдатная падзея, якая паўплывала на яе генетычныя вытокі, на літаратуру, мастацкую культуру, філасофскую думку, маральныя каштоўнасці і эстэтычныя ідэалы народа? Вось пытанні, на якія спрабуе д[illegible] адказы аўтар кнігі пра д[illegible]ны подзвіг «доктара ў лекарскіх навуках і свабодных мастацтвах» з некалі слаўнага горада Полацка. Перад намі не толькі навуковая ма[illegible]графія, і не дысертацыйн[illegible]следаванне, ад якога чака[illegible]ць педантычнага аналізу першакрыніц, што раней не даследаваліся альбо ўводзіліся ў навуковы кантэкст аднабока ці нават тэндэнцыйна.

Ёсць у кніжцы Аляксея Каўкі і вяртанне да першаасноў, і крытыка «навуковых» штампаў, але ёсць у ёй і даверлівая размова публіцыста з чытачом, жывое пачуццё, захапленне сваім героем і яго справамі. Гэта хутчэй кніга-нарыс, даследаванне-эсэ, яны абавязваюць аўтара звяртацца не толькі да розуму чытача, а яшчэ і да яго пачуццяў, сацыяльных і нацыянальных арыентацый, духоўных каштоўнасцей. Таму было б неапраўдана ацэньваць кніжку толькі на падставе строгіх крытэрыяў аб'ектыўнай доказнасці і паўнаты фактаў. З гэтага боку чытач, відаць, заўважыць у кніжцы нямала гіпатэтычных меркаванняў і здагадак, якія грунтуюцца на інтуіцыі ды гістарычнай аналогіі. Важнае значэнне ў такім навукова-папулярным жанры маюць асабістая перакананасць аўтара, яго пісьменніцкая шчырасць, а якраз яны непасрэдна перадаюцца чытачу, даходзяць да яго душы і сэрца.

Даследчык-публіцыст тактоўна «ўпісвае» постаць Ф. Скарыны ў кантэкст беларускай літаратуры і нацыянальнай культуры. Пачынаючы ад П. Уладзімірава, Я. Карскага і М. Гарэцкага, нашы гісторыкі літаратуры не абміналі гэтую постаць, шмат хто ўсведамляў яе рэнесансную веліч і агульнаславянскае значэнне. Аднак доўгі час даследчыкі абмяжоўваліся ўсведамленнем канкрэтна-гістарычнага значэння яго творчасці ў развіцці так званай «старажытнай» (а больш дакладна—сярэдневяковай і рэнесанснай) літаратуры. Між тым спакваля ўзнікала праблема «Скарына і беларуская сучаснасць». Спатрэбіўся пэўны час, назапашванне значнага духоўнага вопыту, каб літаратурная думка зацікавілася феноменам Скарыны як праявай «нацыянальнай субстанцыі беларускага народа».

Патрэбна была таксама смеласць энтузіяста і пэўная доза «авантурызму» ў добрым сэнсе гэтага слова, каб узяцца за такую кнігу насуперак звычайнаму для нас веданню, што пачынальнікі новай беларускай літаратуры ад Яна Чачота, Яна Баршчэўскага, аўтараў дасціпна-гратэскавых «Энеіды навыварат» і «Тараса на Парнасе» да В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, дарэвалюцыйных Янкі Купалы і Якуба Коласа нават не ўпаміналі імя першадрукара, хоць у агульным плане ўсведамлялі слаўную мінуўшчыну Радзімы і нават стварылі рамантычны вобраз яе «залатога веку», калі родная мова іх народа была дзяржаўнай мовай Вялікага княства Літоўскага. Праўда, калі ўзніклі беларускі друк і нацыянальнае кнігадрукаванне, а газета «Наша ніва» стала грамадскім неафіцыйным інстытутам беларускай культуры, гісторыкі і публіцысты ўпісалі асобу Скарыны і яго спадчыну ў гісторыю роднай літаратуры.

І ўсё ж вобраз Скарыны не стаў сімвалам беларускага культурна-нацыянальнага адраджэння ў XIX—пачатку XX стагоддзяў. З класікаў нашай літаратуры толькі Ф. Багушэвіч геніяльна выявіў трагічны бок рэнесанснай душы гэтага асветніка ў вершы «Безнадзейнасць».

У першай частцы сваёй кнігі Аляксей Каўка далікатна і тактоўна аспрэчвае думку свайго калегі Уладзіміра Калесніка, які ў нарысе «Постаць Скарыны» пераканаўча тлумачыць, чаму новая свецкая літаратура спачатку не запісала ў свой духоўны актыў беларускую Біблію Ф. Скарыны. Як на маю думку, сярод прычын пэўнага разрыву традыцый «старой» і «новай» літаратур было тое, што еўрапейская свецкая культура XIX стагоддзя і следам за ёю тагачасныя даследчыкі няпоўна ўсвядомілі агульнакультурны сэнс Бібліі, а ў нас—свецкі аспект выдавецкай дзейнасці Скарыны. Біблія, якую ён выдаваў на роднай мове, разглядалася імі пераважна з боку рэлігійнай свядомасці і царкоўнай функцыянальнасці, гублялася з поля зроку адкрытая нашаму першадрукару ісціна, што гэтая кніга падсумавала тысячагадовы драматычны шлях станаўлення чалавечай духоўнасці. На жаль, і сёння грамадская думка не ўсвядоміла гэтай праўды ва ўсёй яе паўнаце і глыбіні. У выніку мы не пераадолелі разрыву паміж сучаснай свецкай і даўнейшай хрысціянскай тыпамі культуры.

Была яшчэ адна, спецыфічна «расійская» прычына, якая тлумачыць, чаму новая беларуская літаратура не спяшалася ўключыць у свае традыцыі спадчыну Ф. Скарыны. Як справядліва піша А. Каўка, пасля гвалтоўнага далучэння беларусаў-уніятаў да рускага праваслаўя (1839 год) ідэолагі «западнорусской» плыні спрабавалі клерыкалізаваць традыцыі беларускай культуры, падмацаваўшы свае планы імем

Ф. Скарыны. Так, напрыклад, папячыцель Віленскай вучэбнай акругі выставіў скарынаўскую кнігу «Апостал» у якасці аргумента адвечнага «истинно русского» характара Беларусі.

У першай частцы сваёй кніжкі А. Каўка тлумачыць запозненасць усведамлення подзвігу Скарыны сацыяльна-гістарычнымі ўмовамі, а яшчэ запозненасцю самой нашай літаратуры. Разам з тым ён слушна не пагаджаецца з поглядам на яе развіццё як на працэс, у якім быццам бы амаль няма пераемнасці паміж «старажытным» і «новым» перыядамі. Калі, скажам, паміж асветніцтвам Ф. Скарыны і В. Цяпінскага, з аднаго боку, творчасцю В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, Янкі Купалы, з другога боку, не было непасрэднай тэматычнай сувязі, затое ёсць паміж імі ідэйная пераклічка праз стагоддзі, ёсць шмат агульнага ў разуменні імі патрыятызму, дэмакратызму, народнасці. Праз гэтыя палянцці даследчыку ўдалося раскрыць развіццё скарынінскіх традыцый у новай беларускай літаратуры.

Даследчык звяртае ўвагу чытача на папярэдніка і земляка Скарыны, палачаніна Мацея Дзесятага, стварыўшага ў 1507 годзе шэдэўр — рукапісную кнігу «Дзесятаглаў». У гэты зборнік увайшлі біблейскія кнігі, якія пазней пераклaдаў і выдаваў першадрукар. Праўда, Мікола Нікалаеў, на артыкул якога спасылаецца даследчык («Беларусь», 1987, № 1, с. 19), паведамляе, што не сам Мацей Яновіч, як піша А. Каўка, а яго старэйшы брат быў ігуменам Полацкага манастыра.

У першых раздзелах А. Каўка раскрывае сацыяльна-гістарычныя і духоўныя ўмовы, у якіх нараджаліся такія волаты духу, як Скарына, узнаўляе яго жыццёвы шлях, раскрывае асаблівасці светапогляду, перакладчыцкага майстэрства, мовы і літаратурнага стылю. Сёння працягваюцца спрэчкі пра тое, як звалі Скарыну — Францішкам альбо Францыскам. Аўтар кнігі пераконвае ў правільнасці першай назвы. Зразумела, дабавім мы, у кантэксце беларускай моўнай стыхіі нават усе католікі Францыскі завуцца Францішкамі. Тут, здаецца, спрачацца няма пра што. Ужо раней выказаную думку, паводле якой мова Скарыны — узнёсла-біблейскі стыль старабеларускай мовы, даследчык ілюструе беларускім лексічным матэрыялам ягоных кніг. Ён сведчыць, што гэта адвечная мова нашых бацькоў, дзядоў, прадзедаў і далёкіх продкаў. Тут аўтар сказаў, мабыць, самыя ўзнёслыя словы пра беларускага асветніка і нашу спрадвечную матчыну мову.

Другая частка кнігі Аляксея Каўкі — гэта апавяданне пра тое, як адбывалася засваенне Скарынавай спадчыны ў айчыннай навуцы і беларускай літаратуры. Аўтар звяртае ўвагу чытачоў на унікальнасць Скарыны і разам з тым не абмінае ўвагай пісьменнікаў і асветнікаў другой паловы XVI і XVII стагоддзяў, якія ў шмат чым уступалі першадрукару, аднак развівалі яго кнігавыдавецкую традыцыю. Ні Сымону Буднаму, ні яго паслядоўнікам-антытрынітарыям не хапала Скарынавай агульнанароднасці і той духоўнай повязі са светам, якая спадарожнічае толькі сапраўдным народным абраннікам.

Даследчык уносіць істотныя ўдакладненні ў прывычныя ўяўленні пра Скарыну, разбурае стэрэатыпы, якія склаліся ва ўмовах дэфіцыту інфармацыі, прывычнай для шмат каго самацэнзуры, а часам дагматызму і вульгарнага сацыялагізму. У рэшце рэшт асветніцкія і народна-патрыятычныя ідэі першадрукара ў наяўнай форме ці скрыта выявіліся ў шматгалоссі беларускай дэмакратычнай літаратуры, навукі і публіцыстыкі «нашаніўскага» перыяду.

Да бясспрэчных дасягненняў аўтара кнігі «Тут мой народ» без ваганняў аднясём канцэпцыю народнасці Скарынавай спадчыны, крытыку просталінейнай экстрапаляцыі класавасці ў дачыненні да яе, раскрыццё неадназначнасці, а часам і супрацьлегласці функцый беларускай народнай і царкоўнаславянскай моў, аналіз парафразы скарынінскіх слоў у вершы Сімяона Полацкага «Писание», раскрыццё значэння газеты «Наша ніва» ў барацьбе за народныя ідэалы першадрукара, аналіз класічных твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Алеся Гаруна, іх паслядоўнікаў у плане асветніцкіх ідэалаў Скарыны, урэшце, даследаванне рэмінісцэнцый Скарынавай стылістыкі ў творчасці М. Багдановіча. Адным словам, кніжкі Ф. Скарыны ў рупным даследаванні Аляксея Каўкі — гэта не музейны экспанат, прыгодны для вонкавага апісання, і не толькі помнік старадаўняй літаратуры. Гэта жывая спадчына і чыннік сённяшняй нацыянальнай культуры.

Зразумела, не ўсё з аднолькавым поспехам удалося аўтару кнігі «Тут мой народ». Працам айчынных скарыназнаўцаў не стае аднаго звяна — аналізу заходнееўрапейскіх крыніц, якія паўплывалі на светапогляд і стылістыку Скарыны, а праз яго — на беларускую літаратуру. Гэта не магло не адбіцца і на даследаванн[illegible] Каўкі. Праўда, аддамо [illegible]у належнае, бо ў яго кнізе, бадай што, упершыню ў Беларусі пасля 20-х гадоў сказана добрае слова пра Адама Станкевіча, братоў Івана [illegible] Антона Луцкевічаў, Вац[illegible] Ластоўскага ды іншых дзеячаў культуры, якіх яшчэ нядаўна ў нас «адлучалі» ад Беларусі па матывах палітычных і, мякка кажучы, вельмі спрэчных. Ды і сёння мы яшчэ замоўчваем (і гэта ў разгар перабудовы ды публічнасці!) тых даследчыкаў беларускай культуры, якія жывуць за мяжой і спрачаюцца часам з намі па справах зноў жа палітычных. І тут на першым плане палітыка, а за ёю «палітыкі» не бачаць праблем культуры. Вось і ў кніжцы Аляксея Каўкі абыдзены публікацыі пра Ф. Скарыну ў часопісах «Зніч», «Запісы» ды іншых замежных беларускіх выданнях. Гэта, відаць, тлумачыцца нашай хранічнай «недаперабудовай».

Зрэдку, але сустракаюцца ў кнізе «Тут мой народ» светапоглядныя ацэнкі па першаму ўражанню, так сказаць, імпрэсіяніСцкія, як гэта сталася, напрыклад, пры аднясенні мясцовага «западнорусского» патрыёта П. Красавіцкага, аўтара артыкула «Памятники церковной старины в Витебской губернии» (1911 год) да плыні «маладога беларускага нацыяналізму» (с. 159).

У таленавітым філасофскім эсэ Ігната Абдзіраловіча (І. Канчэўскага) «Адвечным шляхам. Даследзіны беларускага светапогляду» (Вільня, 1921) Ф. Скарына — праваобраз беларускага інтэлігента: кім ён быў — «візантыйцам» альбо «еўрапейцам», праваслаўным ці каталікам — і сёння ніхто не ведае. Затое добра вядома, што шукаў ён агульначалавечую праўду і на Усходзе, і на Захадзе, каб выявіць яе ў рэшце рэшт на свой беларускі лад, падарыць народу Біблію ў яго роднай мове — «тады адзіны праменьчык усечалавечнасці». Кніжка Аляксея Каўкі набліжае нас да гэтага вобраза беларускага асветніка.

Уладзімір КОНАН,
доктар філасофскіх навук.

Фёдар ЯНКОЎСКІ

13 лістапада 1989 года пасля цяжкай, працяглай хваробы на 72-м годзе жыцця памёр вядомы беларускі пісьменнік, заслужаны дзеяч навукі БССР, доктар філалагічных навук, прафесар Фёдар Янкоўскі.

Ф. Янкоўскі нарадзіўся 21 верасня 1918 года ў вёсцы Клетнае Глускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння ў 1936 годзе Рагачоўскага педагагічнага тэхнікума працаваў настаўнікам Буцавіцкай школы Мінскага раёна. У 1939 годзе скончыў завочна Мінскі настаўніцкі інстытут. У час Вялікай Айчыннай вайны — разведчык, начальнік разведкі партызанскага атрада «Грозны» на Міншчыне.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў адказным сакратаром рэдакцыі глускай раённай газеты «Сацыялістычная вёска», настаўнічаў у Глускай сярэдняй школе. Скончыўшы Гродзенскі педагагічны інстытут, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Радашковіцкай сярэдняй школе, вучыўся ў аспірантуры. З 1953 года працаваў выкладчыкам, а з 1956 па 1982 год — загадчыкам кафедры беларускага мовазнаўства Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.


Шырока вядома яго літаратурная творчасць. Кнігі Ф. Янкоўскага «Абразкі», «Прыпыніся на часіну», «І за гарою пакланюся», «Радасць і боль», «З нялёгкіх дарог», «Само слова гаворыць» пазначаны высокай грамадзянскасцю, любоўю да чалавека, да роднага краю. Ён услаўляе подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, дружбу савецкіх людзей.

У некралогу, падпісаным партыйнымі, савецкімі кіраўнікамі, дзеячамі навукі і культуры рэспублікі, адзначаецца, што Ф. Янкоўскі ўнёс вялікі ўклад у развіццё беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства. Пра гэта сведчаць шматлікія кнігі: «Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы», «Дыялектны слоўнік», «Беларускае літаратурнае вымаўленне», «Крылатыя словы і афарызмы», «Пытанні культуры мовы», «Роднае слова», «Беларуская фразеалогія», «Гістарычная граматыка беларускай мовы» і інш.

Выдатны педагог, выкладчык Ф. Янкоўскі выхаваў плеяду таленавітых філолагаў. Ва ўсіх кутках рэспублікі працуюць выхаванцы Фёдара Міхайлавіча.

Ф. Янкоўскі прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Ён з'яўляўся членам рэвізійнай камісіі Саюза пісьменнікаў БССР, членам рады Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, выбіраўся членам парткома і вучонага савета педінстытута, узначальваў рэспубліканскае метадычнае аб'яднанне мовазнаўцаў.

Баявыя і працоўныя заслугі Ф. Янкоўскага адзначаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, «Знак Пашаны», медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.



У новым сезоне Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР прапаноўвае юным гледачам прэм'еру спектакля «Стойкі алавяны салдацік». Гэтая музычная феерыя ў дзвюх дзеях створана па матывах казак Г.-Х. Андэрсена. Паставіў яе рэжысёр Юрый БЯРОЗА, афарміў мастак Анатоль МАРОЗАЎ, балетмайстар — Анатоль КАСТРЫЦКІ, дырыжор — Глеб АЛЯКСАНДРАЎ.

НА ЗДЫМКУ: сцэна з новага спектакля.

Фота У. МЯЖЭВІЧА.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

ХТО ТАКІ ВАЎКАЛАК?

Мабыць, кожнаму з нас знаёмае яшчэ з дзяцінства выслоўе Паўлюка Багрыма «ў ваўкалака абярнуся». Але хто такі ваўкалак, вядома далёка не кожнаму. Паспрабуем разабрацца, адкуль ідуць карані, дзе шукаць вытокі старажытнага (трэба думаць) паганскага міфалагічнага вобраза.

Яшчэ старажытны гісторык Герадот запэўніваў, што неўры, якія быццам бы жылі паблізу ракі Піны і потым рассяліліся сярод славянскага племені будзінаў (першабытных жыхароў даліны Прыпяці.— **А. Н.**), усе былі чараўнікамі, што кожны з іх у крайнім выпадку ператвараўся хоць адзін раз у год на некалькі дзён у ваўка. Далей ён сцвярджае, што «існаваў звычай насіць шубу поўсцю наверх і што менавіта гэта дало падставу да меркавання аб ператварэнні чалавека ў ваўка». Тым не меней, вера ў такое сапраўднае пераўвасабленне існавала не толькі на пінскім Палессі, але і на тэрыторыі ўсёй Беларусі, ажно да пачатку XX стагоддзя. Такі пярэварацень у палешукоў меў назву **воўкулак.**

Нават і ў нашы дні можна пачуць яшчэ сярод вяскоўцаў усемагчымыя былічкі наконт таго, як нейкі канкрэтны чалавек збег у лес і потым палохаў людзей, з'яўляючыся навідавоку ў воўчай шкуры.

Вядомы даследчык беларускай этнаграфіі і фальклору П. Шпілеўскі нават прысвяціў гэтай тэме асобную працу, якая так і называлася «Даследаванне аб ваўкалаках». Вельмі цікава ён разважае аб паходжанні гэтага вобраза не толькі ў беларускай народнай творчасці, але і ўвогуле ва ўсёй славянскай міфалогіі. «**Ваўкалака** (ці **ваўкалека**), — піша вучоны, — пярэварацень, гэта значыць чалавек, якога ператварыў хто-небудзь ці ператварыўся сам па сабе, па свайму жаданню, у ваўка». На Украіне існуюць паданні аб **віўкаліках** — аднавокіх і нават слепавокіх лахматых пярэваратнях. Адсюль і сама назва слова **ваўкалака, ваўкалека, влъколекъ, віўкалік** — будзе азначаць: **воўк-прадказальнік,** чараўнік, які мае сілу і здольнасць зачараваць, ператварыць кагосьці ў ваўка пры дапамозе якога-небудзь зелля (тут П. Шпілеўскі значна звужае «здольнасці» якраз-такі ўсемагутнага напаўчалавека-напаўваўка.— **А. Н.**).

Трэба адзначыць, што сярод патрыярхальных людзей існавала такая думка: **ваўкалакі** падзяляюцца на а) ваўкалакаў-чараўнікоў і б) няшчасных ахвяр (першых вельмі баяліся, а другім спачувалі. — **А. Н.**). Па ўяўленню нашых старажытных продкаў, ваўкалакі-чараўнікі, ператварыўшыся ў ваўкоў, засвойваюць усе самыя адмоўныя якасці і ўласцівасці звяроў-драпежнікаў, робяцца такімі ж крыважэрнымі, як і сапраўдныя ваўкі. Існавала павер'е, паводле якога страшныя ваўкалакі вельмі лютавалі ў калядную ноч. Зараз мы можам растлумачыць, чым гэта было выклікана: у зімовы час ваўкі збіраліся ў зграі і выходзілі на паляванне. А таксама з надыходам

(Заканчэнне на 8-й стар.).

ХТО ТАКІ ВАЎКАЛАК?

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.).

прыцемкаў пачыналі жудасна выць. Прычым, на голас аднаго ваўка адгукаўся другі і г. д. Людзі, вядома ж, маглі бачыць іх у гэты перыяд значна часцей, чым у іншыя часіны года, а калі сюды яшчэ дабавіць страх і фантазію патрыярхальных людзей, то якраз і атрымаем усе зыходныя даныя вышэй згаданага павер'я.

Ваўкалакі-чараўнікі, як і ўвогуле чараўнікі, думалі ў народзе, знаходзяцца ў непасрэднай сувязі з чортам, якому яны прадаюць сваю душу, за што той надае ім магчымасць ператвараць іншых людзей у ваўкалакаў і наадварот. Перадаюць яны сваю нечалавечую здольнасць толькі тым, хто адважыўся прадаць уласную душу нячыстай сіле, і перадаюць пад страшнымі пагрозамі і клятвамі: ніколі не здраджваць і не адыходзіць ад гэтага занятку. Людзі меркавалі, што чараўнікі, якія маглі адвольна ператварацца ў ваўкалакаў, складаюць асобную касту вышэйшых істот, што непасрэдна ўзаемадзейнічаюць з нячыстым духам. У склад гэтай касты ўваходзілі найбольш часта дудары, млынары і пастухі. Чаму менавіта яны? Мабыць таму, што гэтыя людзі ведалі больш, чым іншыя, навін у ваколіцах, а таксама паўсюдна бывалі.

Але гэта яшчэ далёка не ўсё. Нават пасля смерці такога чараўніка-ваўкалака, а паміраў ён звычайна вельмі доўга і цяжка, бо да яго не клікалі папа, яго душа працяглы час не магла пакінуць цела. У выніку гэтага магла ўсхадзіцца прыродная стыхія: навальніца, бура, завея. Людзі лічылі, што ўсе нячыстыя здані прымчаліся развітацца з паміраючым. Перад смерцю, зноў-такі па народнаму павер'ю, ён імкнуўся перадаць сваю патаемную сілу каму-небудзь з родных. Дзеля гэтага ваўкалак прасіў падаць яму вады, хлеба і г. д. Калі толькі рука чалавека, які яго пашкадаваў і выканаў перадсмяротную просьбу, датыкалася да рукі чараўніка, то да першага пераходзіла ўсё чараўніцтва. Нарэшце пярэварацень паміраў. Пасля таго, як цела ваўкалака закопвалі, не верачы ў тое, што ён памёр назаўсёды, на магілу да яго праз некалькі дзён пасля пахавання прыходзілі найбольш старыя і паважаныя людзі з той вёскі, дзе ён жыў у свой час, і забівалі ў свежанасыпаную зямлю тры асінавыя калы: ля галавы, пасярэдзіне і ля ног. Пры гэтым спявалі, прытупваючы, песню:

От так табе, така-ваўкалака!
Кыш, кашкалака, жабалака!
Штоб ты не ўстаў,
З асінкаю прапаў!
Асінкаю табе па барадзе,
Па сэрцу, па каленцу!

Цяпер паспрабуем высветліць наступнае пытанне: чаму менавіта ў ваўка ператвараліся людзі-чараўнікі? Справа ў тым, што старажытныя бестэарыі правільна адзначалі сілу і пражэрлівасць ваўка, яго здольнасць нячутна падбірацца да аўчарні, але, з другога боку, у іх згадваліся нейкія фантастычныя рысы: ад голаду, маўляў, воўк есць зямлю, шыя ў яго не гнецца, а варочаецца ўсё тулава. Паводле сцвярджэнняў, якія выказваліся ў бестэарыях, калі чалавек убачыць ваўка ў лесе першым, то той яго не чэпіць, бо страціць сілу і крыважэрнасць ад чалавечага погляду, але ўжо калі першым звер заўважыць чалавека — падарожнік нават губляе свой голас. Тады яму застаецца адзінае — стаяць і не варушыцца, спадзявацца на тое, што, можа, воўк нічога благога і не зробіць. Раілі яшчэ сяляне наступнае: каб страх адышоў, чалавек, які ўбачыў ваўка, павінен быў скінуць з сябе вопратку, знайсці два камяні, стаць на скінутую вопратку і стукаць камень аб камень да той пары, пакуль драпежнік не ўцячэ.

Але, хоць людзі і баяліся ваўка, палохаліся яго, тым не меней, яны яго не ненавідзелі беспаваротна. У гэтым вобразе ўсё ж нешта вельмі прыцягвала. Крыважэрны драпежнік з сівых стагоддзяў лічыўся сімвалам ночы і зімы, нават самой смерці. Да таго ж, нашы продкі часам сцвярджалі, што воўк — гэта прамая сувязь зямлі з сонцам. Магчыма, падставай для такога параўнання паслужыла нестамляльнасць звера («ваўка ногі кормяць», — кажуць у народзе), тое, як ён «коціцца за сваёй ахвярай», як ён хутка і ўмела распраўляецца з хатнімі жывёлінамі, а падчас і з людзьмі.

Трэба яшчэ ўлічыць і той факт, што ў далёкія часіны кожнае племя мела свайго татэма. Звычайна выбіралі мядзведзя, ваўка, лісіцу і г. д. Але паляўнічыя з асаблівым задавальненнем і ахвотай пераапраналіся менавіта ў ваўка. Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што ў балтаў быў бог-воўк, а ў яго свае ўласныя воіны, якія ў бітву кідаліся гэтак жа адчайна і смела, як і ваўкі на сваю ахвяру. Патрэбна адзначыць, што перад боем такія воіны звычайна прымалі наркотыкі, а пасля іх, як вядома, чалавеку ўжо ўсё роўна, што рабіць, ён сябе не кантралюе.

Патрыярхальныя [illegible]і пачыналі з пакланення З[illegible] Лікейскаму («лікас» — азна[illegible]е воўк), калісьці гэты бог патрабаваў нават людскіх ахвяр. Урачыста праходзілі ў Стараж[illegible]ым Рыме і воўчыя святы [illegible]перкаліі, таму што легендарныя заснавальнікі горада былі ўскормлены малаком ваўчыцы.

Вось чаму тут нават цяжка адназначна адказаць, чаму звер, які асабліва нічым добрым і не дагадзіў чалавеку, быў так мілы яго сэрцу. Але ж, адзначым, ёсць вядомы кожнаму з дзяцінства шэранькі ваўчок з калыханкі, Шэры воўк, які дапамагаў казачнаму герою Івану-царэвічу, ваўкі, якія выхавалі Маўглі... А з другога боку, трэба меркаваць, што, прыцягваючы ўвагу чалавека сваёй сілай, хітрасцю, адвагай, а галоўнае — беспакаранасцю, вобраз ваўка адмоўна паўплываў на фарміраванне зборнага вобраза чалавека-ваўка, які паступова ператварыўся ў ваўкалака. Такі міфалагічны персанаж стаў сацыяльна небяспечным, здольным на любое гвалтоўнае дзеянне, забойства.

Тэалагічныя спрэчкі наконт усяго гэтага завяршыліся вывадам, што д'ябал не ператварае цалкам чалавека ў ваўка, а толькі апранае, ахутвае яго воблакам і прымушае іншых бачыць у ім звера. Справіцца з ваўкалакам можна толькі тым манерам, пра які мы згадвалі вышэй, ды яшчэ перажагнаўшыся крыжам (гэтак думалі старажытныя беларусы). А вось у некаторых усходнееўрапейскіх паданнях на ваўкалака ўвогуле немагчыма чым-небудзь уздзейнічаць (нават крыжам ці абразом!). Сербы ў свой час сцвярджалі, што калі ўсе вуглы старанна нацерці часнаком, то тады ніякі ваўкалак не страшны. Забіць яго можна толькі срэбранай куляй ці замоўленым у царкве жазлом.

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што ваўкалакі, ці, як іх яшчэ называюць, пярэваратні, існуюць у народнай міфалогіі сотні гадоў і нават цяжка сказаць, калі вобразы гэтых фальклорных персанажаў перастануць развівацца канчаткова. Бо пастаянна даводзіцца чуць, чытаць пра розныя здарэнні, якія прыпісваюцца ўсё тым жа ваўкалакам.

Аляксей НЕНАДАВЕЦ.





ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ



Яркім святам стаў для жыхароў Магілёва кірмаш «Залатая восень». Ён парадаваў багаццем гародніны і фруктаў, вырашчаных не толькі на палях і ў садах вобласці, але і прывезеных з паўднёвых раёнаў краіны. Былі прадстаўлены тут і прамысловыя тавары. Ну а які ж кірмаш абыходзіцца без музыкі, народных гулянняў і пацех! «Залатая восень» не парушыла гэтых традыцый. Канцэрты, спартыўныя выступленні, выстаўкі і аўкцыёны дарылі яе наведвальнікам добры настрой.

НА ЗДЫМКАХ: запрашае кірмаш; паказальныя выступленні дзіцяча-юнацкай коннаспартыўнай школы вёскі Нікалаеўка; выступае танцавальны ансамбль Магілёўскага культасветвучылішча; багаццем дароў зямлі парадавала пакупнікоў аграгандлёвая фірма «Вейна».

Фота С. ЖАЛУДОВІЧА.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
МІНСК-5, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі

Індэкс 63854. Зак. № 1334